# 1941 — 1945

## ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

### У першыя дні

Вайна, якую вераломна пачала 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія супраць Савецкага Саюза, стала суровым выпрабаваннем для нашага народа, у тым ліку і для жыхароў Асіповіцкага раёна.

Жыхары раёна даведаліся пра пачатак вайны ў 12 гадзін з выступлення па радыё намесніка старшыні СНК СССР, наркома замежных спраў В.М.Молатава.

Жыццё горада і раёна рэзка змянілася. На прадпрыемствах і ва ўсіх сельсаветах былі праведзены мітынгі і сходы, на якіх працоўныя выказвалі гнеў і абурэнне фашысцкімі захопнікамі, упэўненасць у хуткім разгроме агрэсараў на іх жа тэрыторыі.

Тады, у першыя дні вайны, ніхто яшчэ не ведаў, нават не мог і прадбачыць, якія цяжкія пакуты, выпрабаванні, ахвяры чакаюць наперадзе.

У Асіповічах і раёне былі зроблены тэрміновыя захады па пераводзе ўсяго жыцця на ваенны лад, і перш за ўсё чыгуначнага вузла, па аказанні ўсебаковай дапамогі Чырвонай арміі. 23—25 чэрвеня райваенкамат арганізавана правёў мабілізацыю ваеннаабавязаных. Але завяршыць мерапрыемствы па пераводзе ўсяго жыцця на ваенны лад з-за хуткага прасоўвання варожых войскаў не ўдалося.

Першыя ўдары па Асіповіцкім чыгуначным вузле і ваенным гарадку нямецкая авіяцыя нанесла ў ноч з 22 на 23 чэрвеня.

На тэрыторыі Беларусі, галоўным напрамку ўдару фашысцкіх войскаў, наступала буйнейшая нямецкая група армій «Цэнтр» у складзе 4-й і 9-й палявых армій, 2-й і 3-й танкавых груп, усяго 50 дывізій, у тым ліку 15 танкавых і матарызаваных, і двух матарызаваных брыгад. Яе падтрымліваў 2-і паветраны флот — звыш 1700 баявых самалётаў. Групе армій «Цэнтр» было перададзена больш за трэць усіх інжынерных і дарожна-будаўнічых войскаў і каля паловы асобных артылерыйскіх, зенітных і процітанкавых дывізіёнаў і батарэй рэзерву сухапутных сіл Германіі.

Пачатак ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі для войскаў Заходняй Асобай ваеннай акругі (з 22 чэрвеня 1941 г. — Заходняга фронту) быў трагічны. За першы дзень баёў нямецкія перадавыя часці прасунуліся па беларускай тэрыторыі на 35, а месцамі да 50 кіламетраў, адкрыўшы прастор для вядзення баявых дзеянняў асноўным сілам групы армій «Цэнтр».

У прыгранічных баях войскі 3, 4 і 10-й армій Заходняга фронту панеслі